**Салаўёў М.**

# ЗАГІНУЎ
# У СОРАК ДРУГІМ

**Сямён Іванавіч Азараў нарадзіўся ў 1909 годзе ў вёсцы Вілейка Чавускага раёна. Загінуў 7 мая 1942 года на Кесценьгаўскім напрамку. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена падпалкоўніку Азараву пасмяротна.**

**Байцоў вядзе Азараў**

Да пачатку Вялікай Айчындай вайны Сямён Іванавіч Азараў аддаў Чырвонай Арміі амаль трынаццаць год свайго жыцця. Пачаўшы службу радавым байцом, ён сустрэў ворага на чале стралковага батальёна далёка ад роднай Беларусі, на Поўначы, на Мурманскім напрамку. На яго грудзях ззяў ордэн Чырвонай Зоркі, атрыманы за адвагу ў баях супраць белафінаў у 1939 годзе.

Восенню сорак першага года пасля лячэння ў шпіталі маёр Азараў агрымаў новае назначэнне і стаў камандзірам палка ў Палярнай дывізіі, сфарміраванай з працоўных Мурманска і вобласці. Дывізія стала на Лоух-Кесценьгаўскім напрамку і паспяхова стрымлівала ворага. І не толькі стрымлівала, але і наступала. 19 лістапада 1941 года артылерыя нанесла ўдар па варожай абароне. Працягваўся ён нядоўга. Аднак сваім агнём артылерысты дадамаглі парушыць абарону фашыстаў. Калі полк Азарава ўзняўся ў атаку, байцы паспяхова пераадолелі адлегласць, аддзяляўшую іх ад першай траншэі, і ўварваліся ў яе. Завязалася рукапашная стычка. Салдаты з 6-й горна-егерскай. дывізіі , не вытрымалі штыкавога ўдара воінаў Азарава, сталі кідаць зброю і хутка адступаць. Атака палка маёра Азарава мела немалаважнае значэнне. Вораг не толькі быў адкінуты на некалькі кіламетраў, але вымушан быў пакінуць спрыяльныя пазіцыі і адмовіўся ад наступлення, якое меркаваў ажыццявіць на гэтым участку фронту.

**Талент камандзіра**

Пацярпеўшы няўдачу на гэтым участку, праціўнік вырашыў узяць рэванш на другім – Масельскім. Ворагі падрыхтавалі і кінулі на пазіцыі савецкіх войск два палкі белафінаў, брыгаду і лыжны батальён немцаў. Завязаліся ўпартыя баі. Яны пагражалі зацягнуцца. Тады камандаванне нашай арміі вырашыла магутным артылерыйскім ударам спыніць наступ ворага і паралізаваць яго, а часці фашыстаў, якія ўклініліся ў нашу абарону, знішчыць. Для выканання задуманага

плана на Масельскі напрамак была тэрмінова перакінута і Палярная дывізія палкоўніка С. В. Каламійца. Камандзір дывізіі высока цаніў камандзірскае ўменне маёра Азарава, паважаў яго за смеласць і прызнаваў за ім талент сапраўднага байца, які ўмее ў рашаючую хвіліну знайсці правільны выхад, павесці за сабой усіх байцоў. Калі палкоўніку Каламійцу давялося рашаць, хто ж нанясе першы ўдар па праціўніку, ён, не вагаючыся, прадставіў гэга права камандзіру 290-га стралковага палка маёру Сямёну Азараву. І той апраўдаў надзеі камандзіра – яго полк ударыў па ворагу з такой сілай, што немцы і фіны дрогнулі, падаліся назад, і хутка сталі адступаць.

Наступіў сорак другі год. Палярная дывізія, ператвораная да гэтага часу ў 186-ю стралковую дывізію, была зноў перакінута на Лоух-Кесценьгаўскі напрамак, дзе камандаванне арміі вырашыла праравць врожую абарону. Усю зіму і вясну ішла абарона, а ў пачатку мая сорак другога года нашы часці прыступілі да выканання намечанага плана.

**Пісьмо дадому**

Падпалкоўнік Азараў атрымаў загад напярэдадні 7 мая. Да пачатку атакі быў яшчэ час, і Сямён Іванавіч вырашыў напісаць пісьмы дамоў – жонцы і дачцы. У зямлянцы было ціха, толькі патрэсквалі дровы ў пячурцы, ды мітусілася полымя свечкі. Схіліўшыся над збітым з дошак сталом, палажыўшы перад сабой лісток паперы, пісаў Сямён Іванавіч пісьмо дачцы. Яно было кароткім:

"Дарагая дачушка! Пішу табе ў зямлянцы, у 250 метрах ад гітлераўцаў. Хутка пачнецца бой. Мы пераходзім у наступленне і, я перакананы, пагонім ворага...

Будзь здаровая і шчаслівая. Да хуткай перамогі! Твой бацька".

**Апошні загад камандзіра**

Дзень 7 мая 1942 года выдаўся з прахалодай, пахмурны. Цёмныя хмары нізка паўзлі над зямлёй і ў любую хвіліну можна было чакаць, што палье дождж. Аднак праходзіла хвіліна за хвілінай, а дажджу не было. Потым пачалася артылерыйская падрыхтоўка, і думаць аб дажджы не было часу.

Пад прыкрыццём артылерыйскага агню полк Азарава падышоў да зоны варожай абароны і падрыхтаваўся да атакі. Падпалкоўнік разумеў, што яго байцам прадстаіць выканаць цяжкую справу – праравць абарону праціўніка і авалодаць вышынёй Фігурная, якая гаспадарыла над прылягаючай мясцовасцю і была ператорана фашыстамі ва ўмацаваны апорны пуінкт з вялікай колькасцю дзотаў і іншых агнявых кропак.

Рыхтуючыся да гэтага бою, камандзір 290-га стралковага палка вырашыў раптоўнай атакай захапіць дарогу Акунёва Губа – Кесценьга, якая праходзіла паўднёвей вышыні, адрэзаць баявыя парадкі праціўніка ад базы, а потым і захапіць умацаваную вышыню. У

перадсвітальным змроку, таямніча прыціскаючыся да зямлі, салдаты Азарава набліжаліся да дарогі. Вораг выявіў воінаў і адкрыў агонь з мінамётаў і кулямётаў. Стварылася сітуацыя, пры якой малейшае зацягванне магло прывесці да зрыву так удала начатай атакі. Падпалкоўнік Азараў не мог дапусціць гэтага. Ён узняўся ва ўвесь рост і над полем прагучаў яго заклік:

– За Радзіму! Уперад!

За камандзірам палка памкнуліся воіны, натхнёныя мужнасцю падпалкоўніка Азарава. Байцы кінуліся ў атаку і захапілі дарогу. Аднак дарагой цаной заплацілі яны за той поспех – у час атакі варожай куляй быў смяротна паранены камандзір палка. Упаўшы на халодную зямлю, Сямён Іванавіч сабраў апошнія сілы, загадаў воінам палка;

– Уперад, на вышыню!

Полк выканаў апошні загад свайго камандзіра, штурмам узяў вышыню Фігурная і выбіў з яе фашыстаў, знішчыўшы пры гэтым некалькі дзесяткаў салдат і афіцэраў праціўніка, вывеў са строю дзоты.

**Прысвоена пасмяротна...**

Камандаванне 186-й стралковай дывізіі высока ацаніла мужнасць і адвагу камандзіра 290-га стралковага палка. Камандзір дывізіі пісаў:

"...У майскіх баях на Кесценьгаўскім напрамку падпалкоўнік Азараў паспяхова выканаў задачу камандавання. Пры гэтым было знішчана шмат жывой сілы і тэхнікі праціўніка. Пазней полк вёў цяжкія баі з пераўзыходзячымі сіламі гітлераўцаў у раёне Фігурнай вышыні. У час атакі 7 мая 1942 года пры спробе фашыстаў захапіць дарогу Акунёва Губа – Кесценьга загінуў на поле бою".

22 лютага 1943 года Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР прысвоіў пасмяротна падпалкоўніку Азараву Сямёну Іванавічу, ураджэнцу вёскі Вілейка Чавускага раёна, званне Героя Савецкага Саюза.

**Салаўёў, М. Загінуў у сорак другім / М. Салаўёў // Іскра (Чавусы). — 1975. — 29 сакавіка. — С. 4 :фота.**